УДК 33 (091)

*Т.С. Сілюк*

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ІВАЦЭВІЧЧЫНЫ Ў СКЛАДЗЕ ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1921–1939 гг.)

У артыкуле на аснове архіўных матэрыялаў разглядаюцца асноўныя напрамкі рэалізацыі аграрнай рэформы польскага ўрада на Івацэвіцкіх землях у 1921–1939 гг.: парцэляцыя, камасацыя, хутарызацыя, ваеннае асадніцтва і ліквідацыя сервітутаў. Асвятляюцца спосабы крэдытнай дапамогі пры камасацыі і хутарызацыі. Таксама характарызуецца стан і асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гандлю Івацэвіччыны.

## Уводзіны

У выніку савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Беларусь была падзелена на дзве часткі. Заходнія землі яе былі далучаны да буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., да Польшчы адышлі Гродзенская губерня, часткі Віленскай і Мінскай губерні. Івацэвіцкія землі цалкам папалі пад польскую юрысдыкцыю. На гэтых землях устанавілася польская буржуазна-памешчыцкая ўлада, быў уведзены прыняты ў Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – ваяводствы, паветы, гміны.

Рэгіён быў адарваны ад сістэмы расійскіх эканамічных, вытворчых адносін, усерасійскага рынку і міжрэгіянальнага падзелу вытворчасці. Эканамічная палітыка правячых колаў была скіравана на тое, каб пакінуць «усходнія крэсы» (ускраіны) у становішчы аграрна-сыравіннага прыдатку больш развітых прамысловых раёнаў карэннай Польшчы. Карыстаючыся таннай сыравінай і рабочай сілай ва ўмовах аграрнанга перанасялення і масавага беспрацоўя, польскія капіталісты асуджалі край на адсталасць і галечу.

Значная частка насельніцтва Івацэвіччыны ў 1921–1939 гг. жыла ў вёсцы і толькі 15 % ад агульнай колькасці – у горадзе. Асноўнымі групамі вясковага насельніцтва былі памешчыкі і сяляне. Сістэма землекарыстання і земляўладання ў рэгіёне склалася не адразу. Па дадзеных польскай афіцыяльнай статыстыкі, у 1921 г. землі былі размеркаваны наступным чынам: дзяржаве належала 10,8 % ад усёй зямлі, царкве – 0,3 %, прыватным уласнікам (буйным і дробным) – 88,4 %, іншым – 0,5 %. З усіх відаў уласнасці дамінуючае становішча займала прыватнае землеўладанне, якое і вызначала характар аграрных адносін.

## Парцэляцыя

Улады ІІ Рэчы Паспалітай жадалі аздаравіць польскую эканоміку, і, захапіўшы тэрыторыю Заходняй Беларусі, распаўсюдзілі на яе тэрыторыю закон ад 10 ліпеня 1919 г. «Устава сейму аб умовах зямельнай рэформы». Галоўным напрамкам аграрнай рэформы была *парцэляцыя* і продаж часткі памешчыцкіх і дзяржаўных зямель дробнымі ўчасткамі (парцэламі) ад 2 да 20 га праз дзяржаўныя банкі.

Закон устанаўліваў максімальную колькасць зямлі, якой мог валодаць адзін гаспадар. Лішкі належалі прымусоваму адчужэнню з аплатай іх кошту і парцэляцыі. У цэнтральных раёнах Польшчы максімальны надзел мог быць не болей 180 га, у прыгарадных і прамысловых зонах – 60 га, у Заходняй Беларусі – 400 га. Такія вялікія

плошчы на «ўсходніх крэсах» былі ўстаноўлены для таго, каб захаваць эканамічнае панаванне і палітычны ўплыў польскіх памешчыкаў на беларускае насельніцтва.

Закон абараняў інтарэсы памешчыкаў, паколькі былі ўстаноўлены высокія выкупныя цэны на адчужаемую пад парцэляцыю зямлю. На 1 красавіка 1930 г. кошт зямлі (у залежнасці ад адлегласці ад горада), складаў: ворная зямля ад 120 да 2 700 злотых за 1 га; лугі – 120–2 250 злотых; паша – 90–600 злотых за 1 га. Устанаўліваліся і надбаўкі на якасць, ступень апрацоўкі зямлі, меліярацыйныя работы, наяўнасць пасеваў, крыніц вады і інш.

На Івацэвіччыне зямля парцэлявалася ў маёнтках Серадава, Коланск, Бараны, Плянта-Гацкая, Амельна-Тэадорава, Вядатупіцы, Целяханы (урочышча «Пусткі») Блоты-Вядатупічскія Касаўскага павета, маёнтках Малая Рудня і Шнуры Альбянскія Касаўскай гміны. У маёнтку Обрава гміны Святая Воля было выдзелена на парцэляцыю каля 8 811 га зямлі [6]. У 1924 г. парцэляцыя праходзіла ў маёнтках Альба і Навіны-Упірава. У маёнтку Гошчава з 3 603 га зямлі парцэлявана было толькі 10 га, у маёнтку Івацэвічы з 2 790 га – 20 га, у Целяханах з 57 800 га – 20 га [7, арк. 10].

У 1931 г. адбылася парцэляцыя зямель маёнка Мачты Косаўскай гміны Косаўскага павету. Было выдзелена 3 парцэлы: Андрэю Гардзеніку – 3,75 га за 732 злотых, Уладзіміру Банасевічу – 3,75 га за 735 злотых, Яну Юрашэвічу – 3,9 га за 776 злотых. У 1932 г. з зямель дзяржаўнага маёнтка Обрава было выдзелена 35 парцэляў памерам ад 2 да 5 га.

Значная колькасць зямель 3 і 4 класа (320,78 га) была парцэлявана ў 1935 г. у дзяржаўным маёнтку Косаў. Парцэлы набылі: Лунь Сяргей – 1,32 га за 190 злотых, Галабурда Мікалай – 6,5 га за 480 злотых, Гоган Тэадор – 1,05 га за 180 злотых, Мажэйка Тэадор – 5,78 га за 470 злотых і інш. [8, арк. 32].

Парцэляцыя не магла быць праведзена без абавязковай крэдытнай дапамогі. Але доўгатэрміновыя крэдыты банкі сялянам не выдавалі наогул, а кароткатэрміновыя (на 3 месяцы) выдаваліся пад 14,5 %, пры пераафармленні на год – пад 28 %. Немагчымасць атрымання дзяржаўных крэдытаў вымушала сялян звяртацца да ліхвяроў, якія бралі не менш за 60 % гадавых. Таму распарцэляваную зямлю часцей куплялі заможныя людзі, прычым, як правіла, польскай нацыянальнасці. Пад прыкрыццём парцэляцыі памешчыкі распрадавалі свае горшыя землі па спекулятыўна высокіх цэнах.

У Косаўскім павеце ў 1932 г. налічвалася 10 маёнткаў з плошчай зямлі болей за 100 га, 619 гаспадарак мелі надзелы па 15–60 га, 6 486 гаспадарак – па 5–15 га, а 8 120 гаспадарак – меней за 5 га [11, арк. 3].

**Камасацыя і хутарызацыя**

Ворная зямля ў Заходняй Беларусі была размеркавана нераўнамерна. У Палескім ваяводстве, напрыклад, плошча ворных зямель складала 42,5 %, а на Івацэвіччыне яна не перавышала 11 %. Там было шмат зямлі, якая наогул не апрацоўвалася (балоты, пустэчы). У буйных гаспадарках пусткі маглі складаць да 78–79% усёй зямельнай плошчы. На Івацэвіччыне, як было сказана вышэй, было мала буйных зямельных участкаў, затое шырока была распаўсюджана цераспалосіца, землі былі раскіданы «ў шахматным парадку». Прычым на Палессі разрозненасць зямель дасягала 63 %, у той час як у Польшчы яна складала 46,8 %. Цераспалосіца замаруджвала хуткае і эфектыўнае развіццё сельскай гаспадаркі. Таму асноўнай мэтай мясцовай улады было садзейнічанне аб’яднанню зямель праз *камасацыю і хутарызацыю,* якія б сталі асновай

рацыянальнага размяшчэння ворных зямель і лугоў. Камасацыя – гэта працэс ліквідацыі цераспалосіцы праз звядзенне сялянскіх зямель у адзін участак з наступным выхадам на хутары.

У Палескім ваяводстве камасацыя і рассяленне на хутары пачаліся ў 1927 г. Планы па хутарызацыі былі грандыёзныя. Напрыклад, на 1937–1938 гг. было запланавана на Івацэвіччыне правесці камасацыю зямель і выселіць на хутары 81 гаспадарку з в. Азярцо, 119 гаспадарак – з в. Горталь, 86 – з в. Даргужы, 154 – з в. Скураты, 384 – з вёсак Вулька і Соміна, 149 – з в. Краглевічы, 78 – з в. Карочын, 90 – з в. Ябланка, 205 – з в. Заполле [3, арк. 1–10]. Але дадзеныя планы былі выкананы толькі на 10–20 %, паколькі правядзенне рэформы патрабавала значных грашовых сродкаў, а абсалютная большасць кандыдатаў на высяленне не мелі грошай для перасялення. А патрэбна было не толькі перавезці або пабудаваць хату, але і ўзвесці ўсе гаспадарчыя пабудовы. Такая перспектыва вельмі палохала сялян.

Нягледзячы на гэта, хутарызацыя на Івацэвіччыне закранула многія вёскі: Целяханы, Альшаніцу, Краглевічы, Краі, Даргужы, Долгу, Скураты, Гутку, Вялікую Гаць, Рэчкі, Сакоўцы, Любішчыцы, Мілейкі, Старажоўшчыну, Азарычы, Вядатупічыцы, Святую Волю, Заполле, Горталь, прыватныя маёнткі Целяханы і Навіны-Упірава і інш. З в. Краі выселілася на хутары 149 гаспадарак, з в. Целяханы – 180, з в. Скураты – 73, з в. Гутка – 47, з в. Соміна – 81, з в. Воля – 40, з в. Волька – 203 [9, арк. 35–58].

Камасацыя і хутарызацыя ажыццяўляліся вельмі марудна і па прычыне недахопу ў Зямельнага аддзела кваліфікаваных работнікаў для правядзення землямерных і меліярацыйных работ (былі толькі 1 інжынер і 2 тэхнікі).

Для сялян існавалі 2 спосабы атрымання крэдытнай дапамогі пры камасацыі і хутарызацыі:

1. Неільготны крэдыт ад Палескага зямельнага аддзела, які прызначаўся на перанос ці будаўніцтва пабудоў на аб'яднаныя ўчасткі (1 200–2 500 злотых); на меліярацыйныя работы (600–800 злотых); на набыццё зямлі для павелічэння ўчастка, на тэхнічныя і юрыдычныя дакументы. Агульная сума крэдыта на набыццё зямлі на 1 гаспадарку складала ½ кошту ўсёй зямлі. Крэдыты выдаваліся пад іпатэчны абавязак да 15 год, а на тэхнічныя работы – да 4 гады пад 4 % гадавых.

2. Ільготнае крэдытаванне з дзяржаўнага бюджэту і з прыбыткаў Дзяржаўнага сельскагаспадарчага банка. Крэдыт выдаваўся на 5, 15, 25, 35 гадоў пад 4 % гадавых, прычым на працягу першых 3 гадоў (а зрэдку і 5) не налічваліся працэнты.

Аднак большасць сялян не маглі карыстацца прапанаванымі крэдытамі. Таму Зямельны аддзел Палескага ваяводства хадайнічаў перад Міністэрствам сельскай гаспадаркі аб ліквідацыі ці скарачэнні аплаты за камасацыю зямель з тых вёсак, якія не маглі панесці такія расходы, нават нягледзячы на крэдыты. У 1934 г. удзельнікі хутарызацыі ў в. Целяханы і в. Альшаніца былі вызвалены ад уплаты дзяржаўнага зямельнага падатку на 2 гады. У 1938 г. поўнасцю былі вызвалены ад уплаты дзяржаўнага падатку за хутарызацыю жыхары вёскі Скураты, Каротчын, Дубітава, Горталь, Даргужы, Ябланка, Старажоўшчына, Заполле [10, арк. 77].

**Ваеннае асадніцтва**

Дапаўненнем да ўстановы аб аграрнай рэформе быў закон ад 17 снежня 1920 г. *аб ваенным асадніцтве*, якое павінна было выканаць ролю правадніка польскіх ідэй на далучаных тэрыторыях. Утвараўся асобны фонд з зямельных плошчаў Заходняй

Беларусі, на якіх намячалася рассяліць былых вайскоўцаў, т.зв. ваенных асаднікаў, каб замацаваць акупаваныя землі. Удзельнікі савецка-польскай вайны мелі права бясплатна атрымаць ва ўласнасць да 45 га зямлі. Асаднік павінен быў пасяліцца на сваёй парцэле на працягу года і ў трохгадовы тэрмін асабіста рацыянальна апрацоўваць яе, выплачваць камунальны падатак, ахоўваць і ўтрымліваць у належным стане за ўласны кошт меліярацыйную сістэму, якая знаходзілася на яго ўчастку. У выпадку невыканання гэтых умоў асаднік страчваў зямельны надзел. Асаднікі надзяляліся зямлёй у адпаведнасці з воінскім званнем: палкоўнік мог атрымаць 30 га, капітан – 20, паручнік – 15, радавы – 9–10 га зямлі. Аплата за зямлю павінна была ажыццяўляцца на працягу 30 гадоў штогод, пачынаючы з пятага года пасля атрымання зямлі. Дзяржава аказвала дапамогу асаднікам натурай (давала драўніну, коней, кароў, свіней) або грашыма для абзавядзення гаспадаркай.

Асадніцтва існавала і на Івацэвіцкіх землях. Напрыклад, у дзяржаўным маёнтку Сянкевічы сямі асаднікам было бясплатна выдзелена 12 надзелаў зямлі ад 21–24 га. Акрамя таго, асаднікі атрымалі грашовую дапамогу ад 230 да 800 злотых і ад 40 да 80 $м^3$ будаўнічага дрэва. У маёнтку Серадава асады па 17–26 га атрымалі 9 чалавек. 27 асаднікаў атрымалі зямлю ў дзяржаўным маёнтку Станевічы Целяханскай гміны Косаўскага павета ў 1934 г., яшчэ 24 чалавекі – у 1935 г. У 1932 г. 13 асад было выдзелена ў маёнтку Косаў. У 1932 г. 15 чалавек атрымалі асады ў маёнтку Альба (па 19–27 га), 8 чалавек – у маёнтку Бараны (па 22–28 га), 4 – у маёнтку Альшаніца (па 27–29 га), 8 – у маёнтку Руда (па 19–25 га) [5, арк. 34–41].

З цягам часу ваеннае асадніцтва паступова замяняла цывільнае. Гэта форма была больш дапушчальнай, таму што цывільныя каланісты не выклікалі такога лютага супраціўлення з боку мясцовага насельніцтва.

**Ліквідацыя сервітутаў**

Адным з напрамкаў польскай аграрнай рэформы была *ліквідацыя сервітутаў.* Як і цераспалосіца, сервітуты адносіліся да феадальных перажыткаў і таму падлягалі скасаванню. *Сервітут* у землекарыстанні – гэта права на сумеснае карыстанне пэўным зямельным надзелам (часцей выганам, кустоўем), якія знаходзіліся ў сумесным карыстанні сялян і памешчыкаў. Тэрыторыя сервітутаў павінна была быць юрыдычна аформлена, але часцей за ўсё афіцыйных дакументаў на права карыстання гэтымі землямі ў сялян не было.

Сервітуты (пераважна лясы) былі шырока распаўсюджаны на Івацэвіччыне. У Косаўскім павеце мелася 255 га лясоў з сервітутамі, з іх: прыватных лясоў з сервітутамі – 48 га, дзяржаўных лясоў з сервітутамі – 207 га. Акрамя таго, у в. Гутка 228 га зямель адносіліся да сервітутаў, у в. Краі – 680 га, у прыватным маёнтку Целяханы – 1287 га, у маёнтку Навіны-Упірава – 220 га, у в. Соміна – 433 га, у в. Волька – 1117 га [9, арк. 58]. У сярэднім на 1 гаспадарку прыпадала 9,25 га сервітутаў. Аднак фактычна іх было значна больш, пакольку пасля Першай Сусветнай вайны людзі самавольна карысталіся зямлёй і ляснымі масівамі.

У 30-я гады XX ст. масава праводзілася ліквідацыя сервітутаў на Івацэвіччыне. У Косаве падлягалі ліквідацыі 54 участкі. У 1928–1930 гг. сервітуты былі адабраны ў жыхароў вёскі Гошчава і маёнтка Серадава, у 1934–1939 гг. у сялян вёсак Гутка, Волька, Соміна, маёнтка Целяханы, у 1937–1938 гг. – у Обрава, у 1938 г. – у в. Краі [9, арк. 58]. Вельмі часта замест адабраных сервітутаў сялянам давалі іншыя ўчасткі зямлі. Так, жыхары вёскі Белавічы Косаўскага павета замест адабранага ўрочышча ў 2 000 га атрымалі іншы ўчастак у 225 га, г.зн. у 9 разоў меншы і, акрамя таго, аддалены.

У выніку гэтых махінацый сяляне не маглі ім карыстацца, і зямля адышла да памешчыка. У гэтым жа самым павеце такія дзеянні былі праведзены з жыхарамі вёсак Хрышчановічы і Квасевічы [4, арк. 47].

**Сельская гаспадарка**

Да польскай акупацыі сельская гаспадарка Івацэвіччыны вялася даволі інтэнсіўна. Была ярка выражана яе спецыялізацыя на вытворчасці збожжавых культур, мяса і малака. Памешчыкі і заможныя гаспадары паступова ўводзілі перадавую агратэхніку. Але Першая сусветная вайна аказала вялікі ўплыў на сельскую гаспадарку. Ваенныя дзеянні прывялі да таго, што 64 % жыхароў сталі весці натуральную гаспадарку пры дапамозе прымітыўных сельскагаспадарчых прылад. Сялянскія гаспадаркі пакутавалі ад нястачы жывёлы: каля 29 % гаспадарак не мелі коней, у 58,8 % – было па 1 кані, 15,7 % – былі бескароўнымі, 51,1 % – мелі 1 карову.

Вялікай праблемай для селяніна былі падаткі. Падатковая сістэма была створана так, што дробныя гаспадаркі плацілі падатак большы, чым буйныя. Сяляне, ва ўласнасці якіх былі надзелы да 5 га, плацілі 2,38 злотых з 1 га зямлі, у той жа час уладальнікі буйных латыфундый – толькі 1,01 злотых, а астатнія гаспадаркі з зямельнай плошчай ад 15 да 50 га – 1,89 злотых. Асноўнымі падаткамі былі дзяржаўны зямельны з дадаткам камунальным і на аплату дарог. Прычым першы залежаў ад памераў і якасці зямлі. Напрыклад, у 1938 г. сяляне з в. Гошчава Бандарык Андрэй з 6,56 га зямлі заплаціў дзяржаўны зямельны падатак з дадаткам камунальным у памеры 21,09 злотых, Еўтух Тэадор – з 3,28 га 15,47 злотых, Еўтух Канстанцін – з 5,47 га 25,80 злотых, Еўтух Адам – з 2,74 га 13,69 злотых [1].

Асноўнымі сельскагаспадарчымі культурамі на Івацэвіцкіх землях у польскі перыяд былі пшаніца, жыта і бульба (займалі каля 70 % пасяўных плошчаў). Ураджайнасць знізілася ў параўнанні з даваеннай: пшаніцы – на 12%, жыта – на 9,2 %, бульбы – на 32 % з га. Скараціўся памер пасяўных плошчаў. Напрыклад, у 1925 г. пшаніцай было засеяна 28 % зямельных плошчаў, тады як у 1913 г. – 33,6 %. Пасевы льну і іншых тэхнічных культур былі нязначнымі, а тытунь наогул было забаронена вырошчваць. Аднак тэхнічны прагрэс паступова пранікаў у сельскую гаспадарку. У некаторых вёсках дзейнічалі станцыі па ачыстцы насення: у Косаве, Заполлі, Бусяжы, Волі, Любішчыцах, Міневічах, Святой Волі, Глінна, Коланску, Целяханах, Варанілавічах, Горталі (усяго ў 22 вёсках). У 1931 г. яны ачысцілі 758,2 т насення. У Заполлі на станцыі былі веялка, сячкарня, малацілка, у Варанілавічах – веялка і 3 культыватары, на некоторых былі жнейкі, у Міневічах, Косаве і Бусяжы – млынкі [11, арк. 27].

Жывёлагадоўля прагрэсавала ў гаспадарках заможных сялян і памешчыцкіх маёнтках і насіла мяса-малочны характар. На Івацэвіччыне існавалі кааператывы вытворцаў малака. У Целяханах у такім кааператыве налічвалася 17 членаў, якія абслугоўвалі 23 каровы, у Калонску – 98 членаў (294 каровы), у Косаве – 40 кааператараў (90 кароў). Мясцовая мясная прадукцыя свінагадоўлі вызначалася высокай якасцю і экалагічнымі ўмовамі вытворчасці. Для абслугоўвання жывёлагадоўлі на Івацэвіцкіх землях існавала ветэрынарная служба. У некаторых вёсках дзейнічалі ветэрынарныя амбулаторыі, якія абслугоўвалі навакольныя вёскі. У Косаве за год было абслужана 1 026 розных жывёл, у Целяханскай амбулаторыі вылечылі 494 жывёлы, у Святой Волі – 499 жывёл, у Івацэвічах – 839 жывёл (коней, кароў, авечак, свіней, птушак; найчасцей кароў).

**Сельскагаспадарчыя гурткі і выставы**

На Івацэвіччыне былі шырока распаўсюджаны сельскагаспадарчыя гурткі, якія супрацоўнічалі з органамі ўлады, садзейнічалі стварэнню пунктаў арэнды сельскагаспадарчых машын і інвентара, гандлёва-збытавых арганізацый. Такія гурткі дзейнічалі ў многіх вёсках Косаўскага павета: у в. Любішчыцы (10 членаў), в. Руда (12), в. Альба (18), м. Косаў (14), в. Гошчава (14), в. Бусяж (33), в. Міхновічы (38), в. Заполле (20), в. Святая Воля (24), в. Глінна (25), в. Целяханы (25), в. Амельна. Гурткі арганізоўвалі паказальныя палі, якіх ў Косаўскім павеце было 1,85 га, пункты ачысткі насення, стымулявалі развядзенне кветак на насенне (гэтым відам дзейнасці займаліся 54 чалавекі). Пад патранатам Палескага павятовага таварыства зямельных арганізацый існавалі і гурткі сельскай моладзі: у в. Серадава (11 членаў), м. Косава (18), в. Заполле (25), в. Альба (14), в. Бараны (23), в. Коланск-Амельна (18), м. Целяханы (15), в. Глінна (21).

Сельскагаспадарчыя гурткі займаліся асветніцкай працай сярод мясцовага вясковага насельніцтва, арганізоўвалі гутаркі і курсы па сельскагаспадарчай тэматыцы, конкурсы па вырошчванню буракоў, азімых, капусты, кукурузы, а потым праводзілі паказальныя выставы па выніках конкурсаў. Напрыклад, такія паказы прайшлі ў Косаве 25 кастрычніка 1931 г., у Целяханах – 31 кастрычніка 1931 г. 113 чалавек прадставілі на гэтых выставах свае сельскагаспадарчыя экспанаты, 84 з іх былі ўзнагароджаны за свае дасягненні. У дапамогу сельскім вытворцам дзейнічалі крэдытна-ашчадныя касы ў Івацэвічах, Косаве, Целяханах, Святой Волі. Іх абаротны капітал складаў 174 600 злотых [2, арк. 3–5].

Для стымулявання развіцця сельскай гаспадаркі і ўкаранення передавых метадаў гаспадарання конкурсы і выставы праводзіліся і па ініцыятыве мясцовых улад. Конкурсы па вырошчванні буракоў адбыліся ў Альбе, Бусяжы, Выганашчах, Святой Волі, Лазоўцах; морквы – у Альбе; капусты – у Лазоўцах. У Косаве ўзялі ўдзел у конкурсе 84 чалавекі, у Целяханах – 38. Пераможцамі сталі 36 чалавек, якія прадэманстравалі надзвычай высокую ўраджайнасць выгадаваных культур: буракоў – 1 059 ц/га, морквы – 390 ц/га, капусты – 430 ц/га. Для удзельнікаў конкурсаў былі арганізаваны асветніцкія курсы: 12 сакавіка 1933 г. – у Целяханах, 20 сакавіка – у Косава. У іх узялі ўдзел 25 чалавек. Выкладалі на дадзеных курсах аграрныя інструктары і навукоўцы з Кракава і Варшавы. Пасля заканчэння курсаў былі праведзены экзамены і ўзнагароджаны пераможцы конкурсаў. У якасці ўзнагарод уручалі косы, сярпы, акучнікі, кнігі на сельскагаспадачую тэматыку. Вышэйшых узнагарод было 2: бібліятэчкі па 50 сельскагаспадарчых кніг на суму 145 злотых кожная [11, арк. 30].

**Прамысловасць і промыслы**

Прамысловасць на Івацэвіччыне ў 1921–1939 гг. была развіта даволі слаба, акрамя дрэвaапрацоўваючых фабрык, і ў асноўным была накіравана на задавальненне мясцовых патрэб. Буйных прадпрыемстваў не было, толькі невялікія рамесныя майстэрні. У Косаўскім павеце налічвалася 27 цагельняў, 6 смалярняў, мноства млыноў (16 паравых, 26 ветраных, 3 турбінныя), 8 гарбарняў, 13 бойняў. У Косаве ў 1932 г. працавала друкарня, будаўнічае бюро, цагельня [11, арк. 4, 59–60]. У Целяханах існавалі лясныя промыслы, на якія наймаліся жыхары навакольных вёсак. Заробак рабочых у дзень складаў ад 2,30 да 3 злотых. Падаходны падатак налічваўся ў памеры 6,6 %.

Івацэвіччына, як вядома, багатая на рэкі і азёры, таму там здаўна развіваліся рыбаводства і рыбалоўства. Прыватныя рыбныя абводы ў 1932–1939 гг. існавалі ва ўрочышчы Мерачоўшчына, на азёрах Вулька, Бабровіцкім і Выганашчанскім, на Агінскім канале. На рацэ Грыўда дзейнічалі 6 рыбных абводаў. Рыбакі атрымлівалі ад мясцовых улад (ад павятовага старасты) спецыяльныя «рыбацкія карты» – дазволы на ажыццяўленне сваёй дзейнасці. Каб арганізаваць рацыянальнае выкарыстанне водных багаццяў краю, рыбакі аб’ядноўваліся ў прафесіянальныя суполкі. Напрыклад, у 1932–1935 гг. у Івацэвічах (ва урочышчы Белы Двор) на дабравольнай аснове было ўтворана і існавала таварыства рыбакоў, у якое ўваходзіла 13 чалавек. Таварыства атрымала дазвол на ажыццяўленне рыбалоўства на 518 га азёр.

1 лютага 1939 г. рыбакі азёр Бабровічы, Выганашчы, Вулькаўскае, Гутка (уласнасць К.В. Пуслоўскага) утварылі «Кола рыбакоў у Бабровічах і Выганашчах» з мэтай добрай арганізацыі рыбалоўства, абароны інтарэсаў рыбакоў, кантролю за рацыянальным гаспадараннем на азёрах, барацьбы з грабежніцкімі спосабамі рыбалоўства. На прыватных азёрах Пуслоўскага кожны рыбак павінен быў плаціць 30 грошай за 1 кг вылаўленай рыбы. 6 сакавіка 1939 г. прадстаўнікі «Кола рыбакоў» бралі ўдзел з сходзе вытворцаў стаўковай рыбы ў Варшаве, а 31 сакавіка 1939 г. у рыбацкіх курсах у Слоніме [12, арк. 64–76].

**Гандаль**

Івацэвіччына ў часы панскай Польшчы не з’яўлялася значным цэнтрам гандлю. Мясцовы гандаль развіваўся вельмі марудна. З гэтай тэрыторыі экспартавалі дрэва і піламатэрыялы, збожжа, жывёлу, мяса, сена, масла, яйкі, скуры і інш. Імпартавалі пераважна прамысловыя тавары, а са збожжавых – манныя крупы і проса. На прамысловыя тавары шырокага ўжытку былі ўстаноўлены вельмі высокія цэны, затое былі нізкія цэны на сельскагаспадарчыя прадукты. Напрыклад, 10 кВт электраэнергіі каштавалі 7,3 злотага, 1 л газы каштаваў 35 грошаў. У той жа час 100 кг збожжа каштавала ў сярэднім 12 злотых, рабочы конь – 150–200 злотых, а дойная карова – 100–120 злотых. Для актывізацыі гандлю ў 1922 г. быў арганізаваны Саюз купцоў ў Варшаве, які ў 1930-я гг. меў свае аддзелы ў Целяханах (25 членаў) і ў Косаве (178 членаў). Дзейнасць саюза купцоў была накіравана на ўкараненне новых метадаў гандлю, на інфармаванне членаў аб актуальных падатковых і адміністрацыйных новаўвядзеннях, на падтрыманне кантактаў з іншымі купецкімі аб’яднаннямі.

**Заключэнне**

Сельская гаспадарка Івацэвіччыны ў 1921–1939 гг. увогуле захоўвала рысы аграрнай і тэхнічнай адсталасці, насіла экстэнсіўны характар. Значныя поспехі ў сельскагаспадарчай вытворчасці мелі буйныя памешчыкі і заможныя сяляне, а 74 % гаспадарак жылі ў пастаянным пошуку сродкаў існавання. Паступова з развіццём збожжавай і мяса-малочнай вытворчасці селянін усё больш уцягваўся ў таварна-грашовыя адносіны. Прамысловасць і гандаль былі развіты слаба ў параўнанні з ранейшым перыядам і былі арыентаваны пераважна на мясцовы рынак.

Польскі ўрад на землях Заходняй Беларусі распачаў аграрную рэформу з мэтай паляпшэння становішча простага селяніна, укаранення перадавых метадаў апрацоўкі глебы і павышэння ўрадлівасці зямель. Асноўнымі напрамкамі аграранай рэформы былі камасацыя, хутарызацыя, насаджэнне ваеннага асадніцтва, ліквідацыя сервітутаў. У выніку камасацыі свае зямельныя надзелы павялічылі толькі заможныя сяляне, а пры

выхадзе на хутары яны інтэнсіфікавалі гаспадарку, скарацілі транспартныя расходы, звязаныя з перамяшчэннем прылад працы і ўгнаенняў. Перасяленне на хутары для бядняцкай гаспадаркі звычайна заканчвалася эканамічнай катастрофай. Грабежніцкая ліквідацыя сервітутаў таксама спрыяла пагаршэнню і без таго цяжкага стану сялян. Скасаванне шматвекавых устояў грамадства несла селяніну далейшае збядненне і галечу, вяла да яшчэ больш глыбокай дыферэнцыяцыі вёскі, паглыблення крызісных з'яў унутры грамадства.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Падаткі за 1938 г. у в. Гошчава Касаўскага павета // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДзАБВ). – Фонд 318. – Воп. 1. – Спр. 3.
2. Палескае павятовае таварыства зямельных арганізацый і гурткоў за 1931–1932 гг. // ДзАБВ. – Фонд 263. – Воп. 1. – Спр. 67.
3. План работ па хутарызацыі зямель у Касаўскім і Кобрынскім паветах на 1937–1938 гг. // ДзАБВ. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 2025.
4. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 200 с.
5. Спісы ваенных асаднікаў з пазначэннем зямельных надзелаў у Касаўскім павеце 1932 г. // ДзАБВ. – Фонд Р–60. – Воп. 2. – Спр. 38.
6. Спісы зямель, якія падлягаюць парцэляцыі і хутарызацыі ў Палескім ваяводстве // ДзАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 542.
7. Спісы маёнткаў Івацэвіцкага павета за 1927 г. // ДзАБВ. – Фонд 60. – Воп. 7. – Спр. 574.
8. Справа аб парцэляцыі зямельных участкаў у маёнтку Косаў Косаўскага павета 1935–1939 гг. // ДзАБВ. – Фонд 1. – Воп. 7. – Спр. 1 173.
9. Справа аб хутарызыцыі вёсак Краі, Гутка, Волька, Соміна, маёнтка Целяханы Косаўскага павета 1934–1939 гг. // ДзАБВ. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 2 300.
10. Справа аб хутарызацыі зямель в. Вулька і в. Соміна Целяханскай гміны, Косаўскага павета 1934–1939 гг. // ДзАБВ. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 2 999.
11. Справаздача Косаўскага павятовага камунальнага саюза аб дзейнасці і выкананні бюджэта за 1932–1933 гг. // ДзАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 1 030.
12. Фінансавыя справаздачы аб ахове рыбалоўства і перапіска сельскагаспадарчай палаты і павятовых стараст па пытаннях рыбалоўства 1938–1939 гг. // ДзАБВ. – Фонд 1. – Воп. 7. – Спр. 299.

***Silyuk T. S.*** **Social-economic Development of Ivatsevitchi Region in the Composition of II Rech Pospolita (1921–1939)**

The main directions of realization of agrarian reform of Polish government on Ivatsevichi lands in 1921–1939: parcelation, kamasation, khutorization, the settling of Polish soldiers and the liquidation of servitude on the base of archival documents are considered in the article. The means of credit assistance within the process of kamasation and khutorization are shown. The state and peculiarities of farm development, industry and trade in Ivatsevichi are characterized.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 21.04.2011